ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ '90

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР 29 САКАВІКА № 10 (1639)

МАНАЛОГ З НАГОДЫ...

## ПЕРА-рэгістрацыі

*Ўсё закончылася 19 сакавіка на пасяджэнні камітэта камсамола універсітэта, калі былі падведзены вынікі вялікага і дастаткова шумлівага мерапрыемства. Сутнасць яго не сфармулявана ў Статуце ВЛКСМ. Гэта ідэя «знізу», з'явілася яна на справаздачна-выбарчых сходах і канферэнцыях, у прыватнасці на той, што адбылася ў кастрычніку мінулага года ў нашым універсітэце. Такое рашэнне было рэакцыяй пэўнай часткі камсамольскага актыву на пасіўнасць і бяздзейнасць большасці членаў Саюза.*

Многія факультэцкія камітэты камсамола абмежаваліся аб'явай аб магчымасці свабоднага выхаду з радоў ВЛКСМ. «Рэкардсменамі» аказаліся філалагічны факультэт — 10 яго студэнтаў падалі заявы аб выхадзе з камсамола (адзін па ўзросту), і ФПМ — 11 заяў. На механіка-матэматычным факультэце развітацца з камсамолам вырашылі шасцёра студэнтаў, на гістарычным — двое, па аднаму на біялагічным і юрыдычным, на філасофска-эканамічным такіх жадаючых не знайшлося наогул.

Вынікі пакуль не падведзены на геафаку, хімічным і фізічным факультэтах.

Нават самы павярхоўны аналіз паказвае, што сярод тых, хто добраахвотна пакінуў рады ВЛКСМ, пераважаюць людзі, ужо вызначыўшыя сваю палітычную пазіцыю (у большасці гэта члены нефармальных арганізацый), або тыя, хто нядаўна ўступіў у камсамол і лёгка паддаўся моднаму ўплыву. А большасць тых, хто пакуль не збіраецца выходзіць з радоў ВЛКСМ, дзейнічаюць па прынцыпу: ці мала што можа здарыцца...

Крыху адрознівалася форма перарэгістрацыі, якая прайшла ў камсамольскай арганізацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Яны павінны былі пацвердзіць сваё членства ў камсамоле. Гэта адмовіліся зрабіць 240 чалавек.

Які ўплыў аказалі гэтыя лічбы на аўтарытэт камсамольскай арганізацыі універсітэта? Пакуль цяжка даць дакладны адказ на такое пытанне. Але зразумела ўжо сёння, што нават самая выніковая перарэгістрацыя не можа вырашыць праблему адраджэння камсамола ў вачах моладзі. Справа, як і раней... у справах.

**А. РУСАКОВІЧ,**
намеснік сакратара камітэта камсамола па арганізацыйнай рабоце.

АЎТАГОЛ

## Каму патрэбны перамогі?







*Гэта быў традыцыйны вечар, прысвечаны вынікам мінулага навучальнага года ў спартыўным жыцці універсітэта. На маёй памяці ўжо чацвёрты.*

*У чарговы раз шкада, што не стаў ён сапраўднай падзеяй у агульнауніверсітэцкім жыцці.*

*Чаму, напрыклад, ігнаравалі яго нават дэканы трох самых спартыўных факультэтаў — юрыдычнага, радыёфізікі і электронікі, ФПМ? Чаму за прызамі і граматамі на сцэну ўзнялося менш за палову з шасцідзесяці ўзнагароджаных студэнтаў? Чаму наогул у зале было, акрамя выкладчыкаў кафедры фізвыхавання, больш староннніх людзей, не маючых да спартакіяды універсітэта і да зборных каманд БДУ ніякага дачынення?*

*Людзей у зале прыбавілася, і апладысменты сталі больш дружнымі і гучнымі, чым у час узнагароджання, з выхадам на сцэну групы спартсменаў з клуба «Асахі», якія займаюцца рознымі відамі ўсходніх адзінаборстваў пад кіраўніцтвам Віктара Уладзіміравіча Дайгуненкі, з пачаткам канцэртнай праграмы, падрыхтаванай студэнцкім клубам.*

*...Калі загучалі першыя запісы на такой доўгачаканай дыскатэцы, у холе трэцяга паверху не было дзе яблыку ўпасці. Шкада толькі, што многія з танцуючых адсутнічалі ў зале літаральна дзве гадзіны назад. Нешта страчваем, браты студэнты, калі нам няма справы да тых, хто ўдзелам у спартыўных спаборніцтвах абараняе гонар нашага універсітэта. Хутчэй за ўсё, нам патрэбна нешта іншае?*

А. ПУЦІЛА.

ПРЫВАБНАЯ ПЕРСПЕКТЫВА

## «Зладзюжкі» ва... універсітэце?

Гавораць, Шэкспір не спяшаўся надрукаваць свае п'есы. Але аднойчы ў тэатр «Глобус» прыйшлі стэнографы. Дзякуючы ім свет адкрыў для сябе многія п'есы вялікага драматурга.

У нашым універсітэце ёсць паслядоўнікі стэнографаў-«зладзюжак» шэкспіраўскіх часоў — ужо каля года пры факультэце грамадскіх прафесій існуе завочная школа стэнаграфіі, якой кіруе Уладзіслаў Віктаравіч Герасімаў.

У мінулую суботу, 24 сакавіка, вучні школы, якія ўжо паспелі авалодаць таямнічым курсам знакаў, сабраліся разам — пазнаёміцца паміж сабой, паказаць тое, чаму навучыліся за гэты тэрмін, вядома ж, атрымаць пасведчанні з рук дэкана факультэта грамадскіх прафесій Э. Д. Анісенкі. Для многіх вучняў завочнай школы гэта быў першы ў жыцці дакумент аб адукацыі, бо вялікая частка юных стэнографаў — вучні 9—11 класаў сярэдняй школы.

Прыехалі яны са ўсіх абласцей Беларусі, і таму гэту сустрэчу не без падстаў можна назваць ПЕРШЫМ РЭСПУБЛІКАНСКІМ ЗЛЁТАМ ЮНЫХ СТЭНОГРАФАЎ.

У яго праграме былі конкурсы чыста- і хуткапісання, вельмі цікавы шэкспіраўскі конкурс, па ўмовах якога ўдзельнікі павінны былі застэнаграфаваць разыграную перад імі п'есу.

Самую вялікую колькасць слоў у хвіліну — 60! — застэнаграфавала Таццяна Коханава, вучаніца 11-га класа з гарадскога пасёлка Багушэўск, што на Віцебшчыне.

Важная мэта адбыўшагася мерапрыемства — прыцягненне ўвагі да стэнаграфіі. Уладзіслаў Віктаравіч прарочыць нам стэнаграфічны бум у бліжэйшым будучым. Так што — у вас ёсць магчымасць і неабходнасць паспрабаваць свае здольнасці ў гэтай справе. Сістэма выкладання дастаткова простая, яе засвойваюць нават сямікласнікі. Думайце самі, вырашайце самі...

**С. ШЧЭННІКАВА.**

ТЭРМІНОВА Ў НУМАР

ГУЛЬНІ ДЛЯ ДАРОСЛЫХ

## ПА ФОРМУЛЕ «Я+Я»



На гэты раз мы ідзем наперадзе ў часопіса «Огонек», які аб'явіў конкурс сем'яў, — 24 сакавіка адбыліся спаборніцтвы паміж студэнцкімі сем'ямі нашага універсітэта.

Знайшлося чатыры пары смельчакоў, якія пераадолелі хваляванні і згадзіліся ўдзельнічаць: «Кацярына і Андрэй Панамарэнка з факультэта прыкладной матэматыкі, Таццяна і Вадзім Валодзіны з філфака, Яна і Дзмітрый Белабродскія — гісторыкі, Таццяна і Васіль Палхоўскія з механіка-матэматычнага факультэта.

Вось і пачаліся конкурсныя складанасці накшталт жыццёвых: паспрабуйце купіць за скупую па-студэнцкі «траячку» падарунак сваёй «палове».

Жанчынам неабходна да-Панамарэнка. Таму, акрамя звычайнага букета, ён падазвычайнага букета ён падарыў сваёй жонцы яшчэ і расліну ў гліняным вазоне. Каця адказала не менш арыгінальным падарункам — зялёнай авоськай у скрыначцы з-пад духоў.

Але сямейнае жыццё — не толькі падарункі. У ім бываюць і непрадказальныя сітуацыі.

Напрыклад, калі на якоенебудзь свята маладую сям'ю запрашаюць адначасова бацькі мужа і бацькі жонкі. Над гэтай сітуацыяй давялося падумаць Палхоўскім. Дарэчы, у іх і на самой справе бацькі жывуць у розных гарадах, як прадугледжвалі ўмовы гэтага конкурсу: Тані — у Вільнюсе, Васі — у Мінску. Супругі вырашылі не крыўдзіць ні адных, ні другіх.

— Пойдзем да тваіх бацькоў, павіншуем іх, — прапаноўвае Таня.

— А потым махнём да тваіх, — дадае Васіль.

Чым не выйсце?

Валодзіным дасталася ледзь не самая складаная сітуацыя. Гадавіна вяселля, аб якой муж проста запамятаваў. Ён вяртаецца з заняткаў і з прыемным здзіўленнем заўважае святочны стол: торт, любімы салат... На прагулцы жонка дорыць яму кветачку: «Са святам!» Ён б'е сябе па лбе і дае грошы прадаўцу кіёска кветак са словамі: «Нам увесь кошык!»

Кожная пара хутка зрабіла вячэру з прадуктаў, купленых на тры рублі, атрыманыя ад арганізатараў конкурсу. Але тут новая нечаканасць — у госці прыйшла свякроў. Гэта



ўжо сапраўдная падзея! У такім выпадку можна спытаць: «А што ты нам прывезла?», як Дзіма Белабродскі, весці прыемную гутарку, як Палхоўскія, «прапусціць» чарачку ліманаду (ці яшчэ чаго), як Валодзіны, ці ад хвалявання...

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Дзяжурная служба «Беларускага універсітэта»: Вераніка БЯГУН, Сяргей ГРЫЦ (фота).

## ВАШ АДКАЗ

# «ЯКІ ПУНКТ ВЫ ЎНЕСЛІ Б У ПЛАТФОРМУ ЦК КПСС ДА XXVIII З'ЕЗДА ПАРТЫІ?»

*К. МІХАЙЛАПУЛА, намеснік сакратара камітэта камсамола хімічнага факультэта:*

*— Ведаеце, чаму апошнім часам упаў аўтарытэт Гельмута Коля? Таму што ён не прапануе перспектывы. Так і наша Платформа. У ёй проста перапісаны ідэі і лозунгі. Гаворыцца, напрыклад, пра развіццё дэмакратыі, пашырэнне галоснасці. А якім чынам збіраюцца рабіць гэта? Словы, словы...*

*Камуністы чакалі праграмны дакумент развіцця партыі, а атрымалі скараспелы праект, які кінулі, каб канчаткова не страціць аўтарытэт. Толькі атрымалася ўсё наадварот. Платформа так тонка састаўлена, што зрабі што хочаш, і ўсё будзе ў яе рэчышчы.*

*Штудзіруючы праект, шукаў месца, дзе гаварылася б, што партыя павінна стаць палітычным інстытутам, які рыхтуе палітыкай. Дарэмна.*

## ЧАС «ПІК»

*Сёння ў Беларусі жыве больш за 2 мільёны пенсіянераў. Да 2000 года іх будзе ўжо 3 мільёны.*

*Болей за 300 тысяч інвалідаў.*

*З 60 тысяч адзінокіх састарэлых людзей амаль 30 тысячам патрабуецца пастаянная сацыяльная і медыцынская дапамога. Вялікая колькасць грамадзян Беларусі мае патрэбу ў практычнай дапамозе ў сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС.*

# ПА ЗАКОНУ ЧАЛАВЕЧАГА СУМЛЕННЯ

*Самым жахлівым дэфіцытам становіцца ў грамадстве, дзе ў чалавеку бачаць перш за ўсё працоўныя рукі,— дабрыня, сумленне, міласэрнасць. Ці не таму, што каштоўнасць кожнага з нас вымяралася шкалой эканамічных паказчыкаў, усе сродкі масавай інфармацыі да апошняга часу надакучвалі чытачам стаханаўцамі і перадавікамі вытворчасці і сарамліва маўчалі пра інвалідаў, жабракоў, бяздомных, проста адзінокіх хворых і старых людзей?*



Нарэшце, пра гэта загаварылі, і мы даведаліся, што ў рэспубліцы з 321 тысячы інвалідаў толькі 64 тысячы забяспечаны работай. І вось — нядаўна ў БПІ адкрылася першае ў краіне аддзяленне для навучання інвалідаў. З пачатку года 15 юнакоў і дзяўчат з розных канцоў краіны пачалі навучанне на гэтым аддзяленні. Дзесьці каля 6 месяцаў зойме ў студэнтаў-інвалідаў вучоба на падрыхтоўчых курсах, па заканчэнню якіх усе яны будуць пераведзены на факультэт эканомікі машынабудавання. На думку медыкаў, менавіта гэтая спецыяльнасць найбольш прымальная для інвалідаў па стану здароўя.

12 тысяч рублёў пералічыў факультэту міласэрнасці БПІ Фонд міласэрнасці і здароўя Беларускай ССР, заснаваны ў студзені 1989 года.

З часу стварэння гэтым Фондам і яго аддзяленнямі ў абласцях аказана грашовая дапамога абяздоленым і малазабяспечаным членам нашага грамадства на суму 35 тысяч рублёў.

Сярод прыярытэтных медыцынскіх праграм Фонда выдзелены:

— праграма мер барацьбы з дыябетам;

— анкалагічная праграма.

Ёсць у Фонда і добрыя кантакты з царквой Хрысціян веры Евангельскай. Семдзесят прыхаджан даглядаюць ляжачых хворых у тэрытарыяльным цэнтры. І там жа ў снежні адкрыўся «Салон міласэрнасці», у якім грамадзяне, што церпяць нястачу, могуць бясплатна набыць адзенне, абутак, пасцельную бялізну.

Фонд міласэрнасці і здароўя БССР на шляху станаўлення. З асаблівай удзячнасцю ён прымае добраахвотныя ахвяраванні, незалежна ад таго, ці гэта двухтысячны ўзнос Мінскага гарадскога вылічальнага цэнтра Дзяржкамстата БССР, ці трохтысячны ўзнос кааператыва «Дызайн», ці 13 рублёў ад 6-га класа 91-й школы — бо ўсё гэта каштоўныя праявы чалавечай дабрыні.

**Л. СТАРКОВА,**
старшы рэферэнт Фонду міласэрнасці і здароўя БССР.

***З 15 па 21 красавіка з мэтай рашэння праблем адзінокіх састарэлых грамадзян у краіне праводзіцца «Тыдзень міласэрнасці». У рэспубліцы адбудуцца добрачынныя спектаклі, канцэрты, аўкцыён, збор ахвяраванняў ад прыватных асоб, арганізацый і прадпрыемстваў.***

***РАХУНАК 704901 У РЭСПУБЛІКАНСКІМ ЖЫЛСАЦБАНКУ ГОРАДА МІНСКА.***

## АБМЯРКУЕМ?

# На шляху да абнаўлення

На філалагічным факультэце абмеркаванне Платформы ЦК КПСС да XXVIII з'езда адбылося на сходзе з павесткай «Па шляху да гуманнага дэмакратычнага грамадства». Дасціпны чытач паспяшаецца нагадаць пра несупадзенне з газетным загалоўкам Платформы. Менавіта «грамадства» — камуністы філфака лічаць, што паняцце «сацыялізм» само па сабе прадугледжвае гуманнасць і дэмакратызм.

Пратакол абмеркавання стварaўся ў час зацікаўленай дыскусіі па набалелых пытаннях, закранутых у дакладзе і садакладзе дацэнтаў кафедры паліталогіі С. П. Карэйшы і В. А. Курганава.

Магчыма, аргументы, прыведзеныя ў выступленні дацэнта кафедры беларускай мовы Л. І. Сямешка, дапамаглі прысутным сфармуляваць прапановы аб тым, што сваю палітыку партыя павінна будаваць толькі на аснове навуковага забеспячэння сваёй дзейнасці, вылучаючы на першы план гуманітарныя аспекты, а адзіным шляхам прагназіравання палітыкі партыі павінна быць стварэнне сістэмы карпатлівага вывучэння грамадскай думкі.

Загадчык кафедры тэарэтычнага і агульнага славянскага мовазнаўства прафесар А. Я. Супрун выказаў свае меркаванні наконт сёмага раздзелу Платформы — прынцыпу дэмакратычнага цэнтралізму.

— Паняцце гэта, — лічыць Адам Яўгенавіч, — з'явілася ў іншых гістарычных умовах. Цэнтралізм — катэгорыя недэмакратычная, як і рашэнне аб аднамандатных партыйных акругах (адзін дэлегат ад 4000 чалавек).

Прапаноўваючы вызначыць у Платформе адносіны КПСС да іншых партый і палітычных сіл, сход падкрэсліў неабходнасць распрацоўкі стратэгіі і тактыкі работы КПСС ва ўмовах многапартыйнай сістэмы.

З улікам новых сацыяльна-палітычных абставін камуністы палічылі мэтазгодным рэарганізацыю партыйных органаў, скарачэнне структурных падраздзяленняў партыі, у прыватнасці, ліквідацыю райкомаў партыі ў гарадах.

У выступленнях сакратара партбюро прафесара Б. Ю. Нормана, дэкана факультэта А. А. Воўка, дацэнтаў У. Г. Будая, В. П. Краснея, студэнта В. Валодзіна былі ўнесены ўдакладненні па многіх пунктах Платформы.

На сходзе прысутнічаў інструктар ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ М. М. Фядзеня.

**Т. КАЗАКОВА,**
член партбюро філфака.

# Дыскусія і вынікі

Мы, безумоўна, падтрымліваем многія палажэнні Платформы і разглядаем яе як дакумент выключнай важнасці, кіраўніцтва да дзеяння. Разам з тым на партыйным сходзе камуністы адзначылі, што складваецца ўражанне, быццам прапанаваны дакумент рыхтаваўся наспех, многія палажэнні недастаткова прадуманыя і навукова абгрунтаваныя.

Спрэчная і сама назва Платформы, таму што яна не выключае магчымасці існавання негуманнага, недэмакратычнага сацыялізму. Правільней было б назваць: «Задачы, роля і месца КПСС у сацыялістычным будаўніцтве».

На думку многіх камуністаў, варта больш канкрэтна сфармуляваць вызначэнне сацыялізму, яго мэты і шляхі пабудовы. Не зроблены вывад, на якой стадыі развіцця сацыялізму знаходзіцца краіна. Прэтэндуючы на аснову Праграмы партыі, праект не дае дакладнай перспектывы грамадскага ладу краіны. У ім нічога не гаворыцца пра камунізм, у той жа час партыя пакідае за сабой назву камуністычная.

Сёння ўсё часцей і часцей гучыць слова «сталіншчына». Мы ўжываем яго, калі гаворым аб упушчэннях і незаконных дзеяннях у гаспадаранні і кіраванні краінай у тыя часы, калі «у руля» быў Сталін. Але патрэбна быць прынцыповымі і аб'ектыўнымі і не прыкрываць «сталіншчынай» памылкі і пралікі 80-х гадоў. Неабходна называць рэчы сваімі імёнамі.

У першым раздзеле праекта шмат слоў, накшталт «парываем», «адмаўляемся», «асуджаем», «адхіляем», але няма слоў «прызнаём віну» і «абавязуемся». Не вызначаны рашучыя меры дзеяння.

Раздзел VII «Абнаўленне партыі» ў многім не адпавядае зместу, таму што практычна ніякіх мер не прапануе. Не вызначаны і структурныя змены ў партыйным апараце. Наадварот, ставіцца задача яшчэ больш надаць правоў усёй ступенчатай іерархіі партыйнага апарата.

У пярвічных арганізацыях лічаць, што многія звенні партыйнага апарата наогул не патрэбны. Лідэры партыі павінны выконваць свае функцыі на канкрэтных рабочых месцах, на грамадскіх пачатках, за пэўнае ўзнагароджанне.

Наяўнасць неймаверна вялікага, часам некампетэнтнага ў кіруемай ім сферы апарата, надзеленага незаслужанымі, а часам і незаконнымі прывілеямі, прывяла да ўсялякіх злоўжыванняў, што выклікае незадаволенасць працоўных мас.

Таму камуністы пярвічнай арганізацыі настойваюць: на перабудове кіруючай структуры партыі знізу ўверх; правядзенні прамых альтэрнатыўных выбараў дэлегатаў на з'езд ад партыйных акруг; рэалізацыі прынцыпаў дэмакратызацыі партыі.

**Матэрыял падрыхтавалі:**
**Э. ШАСТАКОВІЧ,**
**Б. МАНАК,**
**Р. ВАДЭЙКА,**
**Г. РЫЛЮК,**
**А. ВЯТЧЫНКІН.**

## ПІНГ-ПОНГ

# ПАКАРАННЕ РУБЛЁМ?

*У якіх выпадках дэканат мае права на працягу семестра пазбаўляць студэнта стыпендыі?*

*Л. МАЛЮКІН,*
*студэнт.*

Адказ на гэта пытанне наш карэспандэнт Л. Праўлоцкая шукала спачатку ў «Зборніку нарматыўных актаў і дакументаў па вышэйшай школе». Прачытала шмат цікавага:

«Назначэнне стыпендый праводзіцца па выніках экзаменацыйных сесій з першага дня наступнага за экзаменацыйнай сесіяй месяца.

Рэктарам ВНУ дазваляецца ў асобных выпадках назначаць стыпендыю студэнтам у перыяд паміж сесіямі».

«Студэнты, якія пазбаўлены права на атрыманне стыпендыі па выніках экзаменацыйнай сесіі, не атрымліваюць стыпендыю, пачынаючы з першага дня наступнага за заканчэннем экзаменацыйнай сесіі месяца».

Наконт матэрыяльнай залежнасці ад вынікаў сесіі ўсё зразумела. А як быць з пазбаўленнем стыпендыі ў перыяд семестра? Гэта ўжо пытанне да галоўнага бухгалтара універсітэта Валянціны Пятроўны САЛАДУХІ:

— Караць нядбайнага студэнта пазбаўленнем стыпендыі ў час семестра — недапушчальна. Нават калі ў яго ёсць пропускі практычных заняткаў. У такіх выпадках павінны «спрацаваць» метады адміністрацыйнага, дысцыплінарнага ўздзеяння: папярэджанне, вымова, строгая вымова.

Спосаб грашовага пакарання прымяняецца толькі тады, калі студэнт нанёс матэрыяльны ўрон навучальнай установе, інтэрнату, дзе жыве. Да таго ж, студэнт пазбаўляецца стыпендыі толькі на перыяд не даўжэй аднаго месяца.

**ПАДКАЗКА:** калі студэнт лічыць сябе пакрыўджаным, ён мае права звяртацца за праўдай у рэктарат.

***Такім чынам, справядлівасць бярэ верх. І тое праўда, адбіраць у студэнта грошы, якія ён зарабіў упартай працай, бяссоннымі начамі, нервовым напружаннем у час сесіі не паджэнтльменску.***

# АЎТАМАБІЛЬ РАЗБУШАВАЎСЯ!

*Чула, што апошнім часам рэзка павялічылася колькасць аварый з цяжкімі вынікамі. Ці то аўтамабілі ў нас такія неўтаймаваныя, ці то пешаходы няспрытныя?*

*Г. СТРОЦКАЯ,*
*студэнтка.*

— Аўтазаводы запэўніваюць у тым, што тэхнічныя характарыстыкі аўтамабіляў пастаянна паляпшаюцца. Між тым на адносіны паміж чалавекам і жалезным «канём» гэта, здаецца, ніяк не ўплывае,— сведчыць супрацоўнік ДАІ УУС Мінгарвыканкома А. КАНАПЛІЦКІ.— За студзень у Мінску паранена ў выніку транспартных аварый 62 чалавекі, 11 загінула. Колькасць загінуўшых (параўноўваем з мінулым годам) узрасла на 57,1 працэнта. З кожных чатырох параненых жывым застаецца толькі адзін.

## ШТО ЗДАРЫЛАСЯ?

# Жахлівымі могуць быць лічбы

Мінула два месяцы 1990 года. Нехта падлічвае колькасць сваіх спраў, іншы радуецца нечакана цёпламу для гэтага часу надвор'ю, камусьці даводзіцца аналізаваць істотныя змены ў асабістым жыцці...

І толькі за лічбамі статыстыкі, вельмі ўраўнаважанай дамы, не знойдзеш — колькі ні шукай — тлумачэнняў і меркаванняў, сфармуляваных прычын і гучных перасцярог. Гэта лічбы. Хоць могуць стаяць яны ў адным радку з жудаснымі словамі «колькасць загінуўшых».

Лічбы бываюць жахлівымі. Як тыя, з якіх складаецца крымінальная статыстыка па Мінску за студзень і люты. Няма ў ёй нічога суцяшальнага. Лічбы злачынстваў усіх відаў павялічыліся за гэтыя месяцы: цяжкіх па лініі крымінальнага вышуку — на 33 працэнты, наўмысных забойстваў — на 27,3 працэнта, грабяжоў — 34,8.

Пра менш цяжкія злачынствы, хоць іх таксама стала больш, неяк недарэчна ўспамінаць. І не цікава слухаць. Крыважэрнымі робяць нас крымінальныя зводкі. І шматлікія катастрофы, аб якіх штодзень паведамляе тэлебачанне. Чым больш глядзім сюжэтаў аб чалавечай смерці, тым складаней здзівіць нас жудаснымі падрабязнасцямі — іх з'яўленне на экране становіцца звычкай. Зразумела, для тых з нас, каго трагедыя не кранула непасрэдна сваёй халоднай далоняй.

Але лічбы злачынстваў растуць, а значыць, такіх людзей застаецца ўсё менш. Нават калі яны сутыкнуліся з дробным ашуканствам, яны ўжо ахвяры. І цень страху доўга будзе крочыць за іх спіной.

Радкі крымінальнай зводкі — часткі аднаго арганізму. Яго імя — грамадства. Галоўная прычына хваробы і галоўны сродак пазбаўлення ад яе.

**В. БЯГУН.**

### ФПМ У БУДАТРАДАЎСКАЙ СПЯЦОЎЦЫ

# Семестр працы і рамантыкі

Самы лепшы студэнцкі час — семестр працы і рамантыкі. Яго няма ў вучэбных праграмах ВНУ. Але не выпадкова зацвердзілася менавіта гэта назва. Больш чвэрці гадоў пасланцы навучальных устаноў рэспублікі ў час летніх канікул будуюць жылыя дамы, пракладваюць дарогі, дапамагаюць збіраць ураджай, працуюць праваднікамі і выхавацелямі. Не засталіся ўбаку і студэнты нашага факультэта. Ужо летам 1971 года ўпершыню выехалі чатыры будатрады. Найбольш паспяхова працаваў тады мужчынскі СА «Градыент».

Нам пашчасціла сустрэцца з некаторымі байцамі гэтага атрада. Яны расказалі аб тым, як летам 1971-га ўзводзілі жылыя дамы, жывёлагадоўчыя фермы. «Градыент» дыслацыраваўся ў Казахстане. Жыхары гэтага краю і сёння памятаюць сваіх старанных памочнікаў.

Ужо на наступны год колькасць атрадаў павялічылася да шасці, адпаведна і колькасць іх удзельнікаў узрасла. З 1971 года школу будатрадаў на факультэце прайшлі больш за пяць тысяч чалавек.

У будаўнічых атрадах нарадзіліся і набылі крылы многія патрыятычныя пачынанні. Стала добрай традыцыяй залічваць у ганаровыя байцы ўдзельнікаў рэвалюцыі, герояў вайны і працы, воінаў-інтэрнацыяналістаў. Стаханаўцамі нашых дзён называюць удзельнікаў атрадаў бязвыплатнай працы, якія пералічваюць свой заробак у Фонд міру, на рахунак дзіцячых дамоў і школ-інтэрнатаў, на будаўніцтва помнікаў героям баявой славы. У мінулым годзе атрадамі ФПМ было пералічана больш за 2,5 тысячы рублёў.

Нашы атрады былі ва ўсіх кутках краіны. Іх памятаюць у Карэліі, Сібіры, Якуціі, Комі АССР, Малдавіі, Крыме, Казахстане і іншых месцах. Атрады нашага факультэта не раз займалі прызавыя месцы ў сацыялістычным спаборніцтве. На працягу некалькіх гадоў атрад «Белая Русь» трымае вядучае месца ва універсітэце.

**С. ЦЕРАХ,**
**начальнік штаба працоўных спраў факультэта.**

# З факультэта па факту

### ЖАРТАЧКІ!?



*Колькасць студэнтаў на факультэце — 1417.*
*З іх дзяўчат — 989.*
*Колькасць выдатнікаў — 143.*
*Тых, хто атрымаў двойкі,— 128.*
*Памер стыпендыі выдатніка на IV—V курсах — 112 рублёў 50 капеек.*
*На ФПМ — 140 Ален.*
*Самае распаўсюджанае імя сярод выкладчыкаў-мужчын — Уладзімір.*
*Самы цяжкі студэнт факультэта мог бы выступаць у вагавай катэгорыі да 125 кг.*
*Рост самага высокага — 206 см.*
*59 студэнтаў (студэнтак) маюць дзяцей.*
*Самы малады студэнт ва ўзросце 17 гадоў.*
*Самаму старому — 26 гадоў.*
*Адметная рыса студэнтак ФПМ — прыгажосць.*
*Тое ж сярод студэнтаў — інтэлект.*
*Лідэр у атрыманні павышанай стыпендыі — 5 група пятага курса — усяго 20 ступендый.*
*Колькасць імянных стыпендыятаў на факультэце — чатыры.*

### ЗАЛІКОЎКА

# «Мы не скардзіліся на сумоту»

ДЛЯ ДАВЕДКІ: М. М. Фядзеня скончыў факультэт прыкладной матэматыкі ў 1973 годзе. Працаваў на кафедры вышэйшай матэматыкі ФПМ асістэнтам, а потым, пасля абароны кандыдацкай дысертацыі,— дацэнтам. У 1986 годзе парткомам БДУ рэкамендаваны на пасаду інструктара аддзела навукі і навучальных устаноў Мінскага гаркома КПБ. У 1988 — зацверджаны загадчыкам гэтага аддзела, а са студзеня 1989-га — інструктар ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ.

З ФПМ мяне звязваюць перш за ўсё гады вучобы і работы на кафедры вышэйшай матэматыкі. Гэта ўспаміны аб станаўленні тады яшчэ самага маладога факультэта ва універсітэце, яго традыцый, навуковых школ. У маім лёсе, выбары прафесіі «вінаваты» два чалавекі — Адольф Фёдаравіч Наумовіч і Юрый Станіслававіч Багданаў.

З Адольфам Фёдаравічам мы ўпершыню сустрэліся на рэспубліканскай матэматычнай алімпіядзе, калі я вучыўся яшчэ ў дзесятым класе. Потым ён чытаў у нас матэматычны аналіз. Я ўдзячны лёсу, што мне пашчасціла слухаць яго сапраўды таленавітыя і віртуозныя лекцыі. Ён умее зацікавіць, зрабіць так, што звычайныя сухія лічбы загучаць цікава і прыцягальна.

Ю. С. Багданаў быў маім навуковым кіраўніком. Самая галоўная яго якасць — інтэлігентнасць. У маёй памяці гэты вобраз асацыіруецца з гранінскім зубрам — столькі многа аналогій у іх лёсах.

Факультэт даў мне і выдатную палітычную загартоўку. У студэнцкія гады мы не скардзіліся на сумоту і тое, што няма чым заняцца. У камсамольцаў была сапраўды актыўная жыццёвая пазіцыя. Наш камітэт камсамола з'яўляўся завадатарам правядзення дзён ФПМ, ініцыятарам арганізацыі студэнцкай агітбрыгады, іншых цікавых спраў.

Калі я прыйшоў працаваць на факультэт, не адзін раз выязджаў камандзірам студэнцкіх сельгасатрадаў. Некалькі гадоў запар узначальваў камсамольскую арганізацыю супрацоўнікаў, потым — партыйнае бюро. Пра гэты час засталіся ў памяці самыя найлепшыя ўспаміны. А галоўнае — дзякуючы ўдзелу ў грамадскіх справах, я навучыўся працаваць з людзьмі, разбірацца ў іх. І гэта мне цудоўна дапамагае ў цяперашняй рабоце, у часам няпростых спрэчках і дыскусіях.

### АД ПЕРШАЙ АСОБЫ

# Узлётная паласа

Праграміст — прафесія будучага. Упэўнена, што надыдзе час, калі прыярытэт работнікаў гандлю ўступіць сваё першынство. На авансцэну выйдуць людзі, якія ўмеюць карыстацца камп'ютэрамі, выдатна ведаюць мовы Паскаль і Фартран.

Што даў нам факультэт?

Грунтоўныя веды. Каб стаць выдатным праграмістам, патрэбна асвоіць вышэйшую матэматыку, машынную графіку, тэхналогію праграміравання і шмат іншага. Практычныя навыкі. У час вытворчых практык на прадпрыемствах і ва універсітэцкіх лабараторыях мы стараліся замацаваць пачутае на лекцыях і семінарах, пазнаёміцца з вытворчасцю, набыць пэўны вопыт работы з людзьмі. Ідэйную і фізічную загартоўку...

Ці толькі вучоба цікавіла нас?

Безумоўна, не. Было яшчэ шмат цікавых спраў, дзе кожны мог раскрыць свае здольнасці: навуковыя гурткі, самадзейныя калектывы, спартыўныя секцыі... Наша група была на дзіва актыўная. Мы стараліся паспяваць усюды: удзельнічалі ў конкурсах, канцэртах, віктарынах, спаборніцтвах, ездзілі ў будаўнічыя атрады і хадзілі ў турыстычныя паходы.

Чым быў для нас факультэт?

Нечым накшталт узлётнай паласы. Мы назапашвалі тут усё неабходнае для будучага палёту.

Якія выкладчыкі вучылі нас?

Скажу шчыра: гэта людзі, якія не толькі выдатна ведаюць матэматычныя дысцыпліны, але і валодаюць артыстызмам, вынаходлівасцю, гумарам. Большасць з іх — выпускнікі ФПМ.

**А. БАЙДА,**
**малодшы навуковы супрацоўнік НДЛ «Дыскрэтная аптымізацыя».**

### САЮЗ КНІГІ І ШТАНГІ

# Вучоба і спорт побач ідуць



Спытайце, што думае наконт гэтага выпускніца ФПМ Дзіяна Шкор. Перакананы: яна пацвердзіць гэту ісціну. У мінулым годзе студэнтка не толькі паспяхова скончыла факультэт і атрымала дыплом з адзнакай, але і стала прызёрам чэмпіянату БССР па спартыўнай хадзьбе, выканала нарматыў майстра спорту СССР.

А вось студэнтка II курса Марына Бондар толькі марыць узысці на спартыўны Алімп. Яе захапленне — не толькі скачкі ў вышыню, дзе яна неаднаразова пераадольвала планку на вышыні 170 см. Шмат часу яна аддае трэніроўкам у альпінісцкай секцыі. І ў залікоўцы толькі выдатныя адзнакі.

Гэта не адзінкавыя прыклады. На факультэце шмат тых, хто спалучае ў сабе студэнта і спартсмена. Не так даўно чэмпіёнам Мінскага абласнога Савета ДФСТ прафсаюзаў па гіравому спорту стаў першакурснік (дарэчы, таксама выдатнік вучобы) Дзмітрый Кухарчук. Мяркуючы па ўсяму, пазіцыі свае ён здаваць не збіраецца. Ён ужо выканаў нарматыў першага разраду ў гэтым нялёгкім відзе спорту і рыхтуецца да новых перамог.

Магчыма, нехта мяне папракне: маўляў, каму патрэбны голыя лічбы. Але каб зразумець заканамернасць усяго сказанага раней, варта прывесці некаторыя з іх. Заслугоўвае павагі і адабрэння тое, што ФПМ — актыўны ўдзельнік агульнауніверсітэцкай круглагадовай Спартакіяды. Два разы ён станавіўся пераможцай і неаднаразова — прызёрам. Найбольш падрыхтаванымі амаль заўсёды аказваліся каманды футбалістаў, лыжнікаў, баскетбалістаў, шахматыстаў, шашыстаў і інш. Вельмі ўдала выступаюць баскетбалісткі, якія восем разоў за час існавання факультэта падымаліся на верхнюю ступеньку п'едэсталу гонару.

Такія поспехі і актыўны ўдзел у спартыўна-масавай рабоце могуць здзівіць хіба толькі недасведчанага чалавека. «Свой» жа ведае, што пытанні развіцця фізкультуры і спорту, удасканалення фізкультурна-аздараўленчай работы кіраўніцтва факультэта не лічыць другараднымі. Наадварот, тут шукаюць новыя формы і метады ўдасканалення гэтай работы. Напрыклад, у 1987 годзе партбюро і савет факультэта зацвердзілі «Палажэнне аб Спартакіядзе ФПМ». Спачатку спаборніцтвы праходзілі па васьмі відах спорту, у якіх прынялі ўдзел 1000 студэнтаў і супрацоўнікаў. Сёлета праводзіцца III Спартакіяда, прысвечаная 20-годдзю факультэта.

Дзякуючы той увазе, якая надаецца на ФПМ фізкультуры і спорту, за два апошнія гады тут больш за 680 студэнтаў выканалі нарматывы масавых разрадаў, 26 чалавек сталі першаразраднікамі, а шасцярым прысвоена званне «кандыдата ў майстры спорту».

Нікога не патрэбна пераконваць у тым, што сёння спецыяліст з вышэйшай адукацыяй павінен мець не толькі выдатную прафесійную падрыхтоўку, глыбокія веды, але і высокі ўзровень культуры. І фізічнай таксама.

**А. МІХНАВЕЦ,**
**старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту.**

### ВОПЫТНЫ ЎЧАСТАК

# Перамагаюць настойлівыя

Мікалай Мікалаевіч добра памятае той час. Неспадзявана неяк усё выйшла. Да Усесаюзнай алімпіяды па праграміраванню заставалася няшмат часу, як яму раптам прапанавалі месца ў камандзе БДУ. Напэўна, таму так хваляваўся. Ды і спаборніцтвы матэматыкаў праводзіліся ўпершыню: ніхто дакладна не ведаў, што там будзе і як.

І вось — заданне выканана, падведзены вынікі. М. Дземеш, студэнт II курса — адзін з пераможцаў Усесаюзнай алімпіяды па праграміраванню. Дарэчы, дзякуючы выдатнай падрыхтоўцы і настойлівасці каманда БДУ заняла на ёй тры першыя месцы.

Гэта быў 1982 год. З таго часу з лёгкай рукі М. М. Дземеша — зараз намесніка дэкана факультэта, наша зборная традыцыйна выходзіць пераможцай ці прызёрам Усесаюзных алімпіяд. А прозвішчы студэнтаў С. Запольскага, І. Волкава, Д. Дварцавога, А. Карзюка становяцца вядомымі праграмістам краіны — яны амаль заўсёды лідыруюць у спаборніцтвах.

Асабліва поспеху дабілася каманда ФПМ у 1988 годзе, калі яна была запрошана на міжнародныя спаборніцтвы па інфарматыцы, прысвечаныя 100-годдзю Сафійскага універсітэта. У алімпіядзе прынялі ўдзел 15 каманд з універсітэтаў Балгарыі, ГДР, Венгрыі, Чэхаславакіі, Польшчы, СССР. Зборная ФПМ заняла другое месца, а яе лідэры Д. Дварцавы і І. Волкаў — адпаведна на першым і чацвёртым. Новае папаўненне факультэта з ліку пераможцаў рэспубліканскіх і Усесаюзных алімпіяд па інфарматыцы ўмацоўваюць надзею, што традыцыі факультэта будуць памножаны.

**У. КОТАЎ,**
**кіраўнік каманды БССР па інфарматыцы, дацэнт.**



# «НАШЫ» ЗА МЯЖОЙ

# ПАЎЖАМІСТ? ВАЛЮНТАРЫЯТ? ШЧАСЛІЎЧЫК!

*У ФРГ няма закона, які б рэгуляваў падрыхтоўку прафесіянальных работнікаў радыё, газет і тэлебачання. Сутнасць становішча з гэтай справай, як прызналі на сустрэчы з савецкімі журналістамі выкладчыкі завочнай школы павышэння журналісцкага майстэрства ў мястэчку Хаген, — хаос. Але вызначаюцца тры класічныя шляхі, якія вядуць у журналістыку: нармальны, акадэмічны і «шчаслівы выпадак».*

**Першы, нармальны.** Вы прыходзіце ў рэдакцыю і просіце месца супрацоўніка. Калі вам ідуць насустрач, на працягу дваццаці шасці месяцаў вы — пазаштатны супрацоўнік. Грошай — мінімум. Спадабаецеся шэфу — станеце паўжамістам (танны ў сэнсе аплаты матэрыялаў работнік), будзеце атрымліваць у месяц крыху больш за дзве тысячы марак. Пры настойлівасці паднімецеся яшчэ на адну прыступку — валюнтарыят. Гэтым тэрмінам азначаецца форма журналісцкай адукацыі, пры якой тры-чатыры гады сумяшчаюцца навучанне і работа. Палова такой катэгорыі работнікаў ужо маюць вышэйшую адукацыю, але не журналісцкую: мова, гісторыя, сацыялогія.

**Другі шлях — акадэмічны.** Ва універсітэце вас вучаць публіцыстыцы, але калі вы скончыце яго, вас чакае нямала праблем. Справа ў тым, што навучанне адарвана ад рэчаіснасці, таму шэф рэдакцыі ні ў якім разе не хоча прызнаваць вас гатовым спецыялістам. У яго ж сумны вопыт — работнік з выпускніка ніякі. Таму студэнты паступова схіляюцца да валюнтарыяту, сумяшчаюць вучобу з работай у студэнцкіх газетах. Такая мадэль падрыхтоўкі мае шмат станоўчага, у навучэнцаў вялікія прафесійныя шанцы.

**Трэцім шляхам вы прыйдзеце ў журналістыку,** калі вам усміхнецца фартуна пры паступленні ў спецыяльную школу ці вучэбную рэдакцыю. Згадзіцеся, гэта шчаслівы выпадак — трапіць у лік 25 навучэнцаў, калі заяў жадаючых набіраецца па 4 тысячы. Вас чакае інтэнсіўнае навучанне, вялікая доля часу аддаецца практыцы. У рэдакцыях вывучаюцца нават рукапісы апублікаваных і неапублікаваных матэрыялаў.

Свет мяняецца з неверагоднай хуткасцю, міжнароднае жыццё стала надзвычай бурлівым. Вялікая задача, якую ставяць перад сабой сёння журналісты Заходняй Германіі, — прымірэнне з Усходам. На Захадзе межы амаль не існуюць. Таму інфармацыя з Усходу, як з першых рук. Ідэя адзінага агульнаеўрапейскага дому — справа сённяшняга дня.

С. ГРЫЦ.
Фота аўтара.







У архіве і рабочых залах рэдакцыі газеты «Вестдойчэ альгемайнэ» — камп'ютэры, тэлетайпы, фотатэлеграфы. Свабодна валодае імі кожны супрацоўнік рэдакцыі.





*Гарадская ратуша ў Дортмундзе заўсёды адкрыта для наведвальнікаў.*
*НА ЗДЫМКУ: будучыя парламентарыі ландтага (зямельнага парламента).*

# ЗАВОЧНАЯ ШКОЛА СТЭНАГРАФІІ

## ПРА ГАЛОСНУЮ «О»

(Галосная О ў канцы слоў)

Галосная О — гарызантальная лінія даўжынёй прыкладна 3/4 меры. Яна ў два разы карацей за галосную Е.

У канцы слоў галосная прыпісваецца да зычных:



о е то те во с со к ко п по д до



лето это под подо лево мимо тесто место веко дико ело

Разам з намі вы, зразумела, пішаце словы правільна. Але калі пачнеце выконваць практыкаванне самастойна, можаце зрабіць такую памылку:



правильно неправильно

Пасля закругленняў не падымайцеся, а адразу пішыце галосную.



можно

ПРАКТЫКАВАННЕ:

**Село пело весело мело стыло вскипело седло имело светло светило пестро подвело шло стекло пекло**

**В это лето. Всем есть место в классе. Мы все идем в свой класс. Стыло стекло. Мы пишем письмо. Мимо плыло весло. По стране. В декабре мело. Можно ли петь в классе? Есть дело для тебя. Мы едем в свое село. В село шло следствие. Это действие. Вещество истлело. Можно ли мыть плед? Вести дело. Это вещество светится. О себе. Все дети в своем классе. Это клесты. В квартире тепло и светло. Едем в депо. Весело в селе. Шило в мешке. Стрелы летели метко. Дело кипело. Мы плыли влево.**

Урок вёў
Уладзіслаў ГЕРАСІМАЎ.

# ПЯЦЬ КАПЕЕК

## Толькі статысты?

Мне здаецца, што, увёўшы студэнтаў у вучоны савет, нас проста ўключылі ў нейкую гульню, правілы якой не прадугледжваюць нашага дзейснага ўдзелу. Няўжо мы толькі статысты для паказной дэмакратыі?

Калі не так, нядрэнна было б убачыць на старонках «Беларускага універсітэта» рэпартаж з аднаго з пасяджэнняў вучонага савета. Магчыма, ёсць там студэнты, здольныя ставіць пытанні і адстойваць свой пункт гледжання.

Не толькі членаў факультэцкіх вучоных саветаў, але і ўсіх нас трэба вучыць галоснасці, дэмакратыі. Не для каго ж не сакрэт, што і з боку студэнцтва хапае амбіцый, неабгрунтаваных прэтэнзій.

Таму і важна паказаць, як вучоны савет узаемадзейнічае са студэнцкімі прадстаўнікамі.

Г. ВАРАБ'ЁВА.

## ПА ФОРМУЛЕ «Я + Я»






*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

забыцца, што свякроў — гэта маці мужа, як атрымалася ў Андрэя Панамарэнкі.

Вось і вынікі падведзены. Ёсць журы — значыць, будуць і балы, і месцы, нічога не зробіш.

Першае месца аддалі Валодзіным, другое — Панамарэнкам, а Белабродскія і Палхоўскія, можна сказаць, падзялілі паміж сабой трэцяе.

Узнагароды за выпрабаванні аказаліся важкімі: чэкавыя кніжкі на 500, 300 і 200 рублёў адпаведна занятым месцам.

...Часам у канцы дзіцячых гульняў гавораць: «Перамагла дружба». Зараз трэба дадаць: яшчэ і каханне.

Т. ЖДАНОВІЧ.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВП імя Я. Коласа.

29 САКАВІКА
Зак. 2008.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.